№ 35 (628)
Верасень 2016 года

Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года

bfk.by

У нумары:

☞ З пошты: *водгук пра музей у Слуцку* – *стар. 2*

☞ Выданне: *для заняткаў пасля ўрокаў* – *стар. 3*

☞ Стагоддзі культуры: *гісторыя полацкай Сафіі* – *стар. 4*

☞ Рэканструкцыя: *баль Магдалены Радзівіл* – *стар. 5*

На тым тыдні...

✓ **1 – 3 верасня** адбыўся **Нацыянальны дзіцяча-маладзёжны форум «Скарынаўскія дні ў Полацку – 2016»**, прысвечаны Дню беларускага пісьменства і Году культуры.

Пад час форуму ў гімназіі № 1 прайшла Скарынаўская алімпіяда, удзельнікі якой прадэманстравалі веды па беларускай мове і літаратуры, гісторыі, паспаборнічалі ў конкурсе рытараў і чытальнікаў. Таксама быў рэалізаваны адкрыты творчы праект «Нашчадкі Скарыны», які ўключаў інтэрактыўны квэст «Брама гісторыі», конкурс сацыяльных ролікаў «Мова пачынаецца з цябе», пленэр «Знакамітаму земляку прысвячаецца...», адкрыты конкурс на стварэнне афіцыйнага гімна «Скарынаўскіх дзён», турнір па інтэлектуальных гульнях «Скарынаўскія гульні» ды інш. Таксама ў дні форуму каля памятных мясцінаў і помнікаў Полацка адбыліся адкрытыя ўрокі «Захоўваючы традыцыі, будуем будучыню!»

✓ **3 верасня** выйшаў **новы выпуск праграмы «Падарожжы дылетанта»** пра вёску Выдранка Краснапольскага раёна. Пабачыць яго можна на сайце перадачы zhygamont.by і на канале перадачы ў YouTube.

Папулярная перадача Юрыя Жыгамонта спыніла выхад на канале СТБ з-за складанай эканамічнай сітуацыі: у канала не знайшлося сродкаў, каб аплачваць выхад праграмы. За столькі гадоў існавання перадачы ў Юрыя з'явілася мноства прыхільнікаў, якія спадзяваліся яшчэ пачуць пазнавальныя гісторыі пра дзівосную Беларусь. Таму вандроўкі перайшлі ў анлайн-фармат. Вядучы на некаторы час спыніў свае падарожжы з-за хваробы, а цяпер зноў будзе распавядаць пра гарады і вёскі.

Перадача «Падарожжы дылетанта» выходзіла на тэлеканалах БТ і СТБ з 2001 года. Было створана некалькі сотняў выпускаў пра вёскі і пасёлкі Беларусі. У 2012 годзе Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь узнагародзіла Ю. Жыгамонта нагрудным знакам «За ўклад у развіццё культуры Беларусі».

✓ **6 верасня** ў выставачнай зале Міністэрстве замежных справаў Рэспублікі Беларусь адбылася **прэзентацыя арт-праекта «Зачараванне» фотамастачкі Ірэны Гудзіеўскай і агенцтва мадэляў «Студыя Тамара»**.

Арт-праект накіраваны на фарміраванне станоўчага і паэтычнага ладу сучаснай Беларусі. Галоўная яго тэма – цесная ўзаемасувязь жаночай прыгажосці і непаўторнасці беларускай прыроды. Абсалютна не этнаграфічны знешне, гэты праект, тым не менш, звязаны з нацыянальнымі сімваламі Беларусі, а ў яго падтэксце прысутнічае беларуская міфалогія. Выстаўка складаецца з 90 працаў і працягвае папаўняцца новымі фатаграфіямі. Здымкі праходзяць у Налібоцкай і Белавежскай пушчах, у вёсках і на хутарах.

✓ **10 верасня** адбылася ўжо традыцыйная **акцыя «Верасневая ноч у Мастацкім»**. Сёлета Нацыянальны мастацкі музей Беларусі запрашаў на музейныя кінасеансы і лекцыі, на своеасаблівую «экскурсійную карусель» па залах беларускага мастацтва XX – XXI стагоддзяў. Адметнасцю акцыі стала адкрыццё ўнікальнай выстаўкі «Прыстанак міласэрнасці» з фондаў расійскага Эрмітажа, на якой прадстаўленыя артэфакты XII – XIII стагоддзяў.

Цягам усёй «Верасневай ночы» ў музеі можна было прайсці спецыяльны асенні квэст па экспазіцыі, пачуць вершы ад таленавітых маладых паэтаў, убачыць танцавальныя і тэатральныя пастаноўкі, зрабіць фотаздымак на памяць.

✓ **14 верасня** ў Музеі тэатральнай і музычнай культуры адкрылася **выстаўка мастачкі Аксаны Аракчэевай «У храме мастацтва»**. На ёй прадстаўленыя партрэты дзеячаў музычнага і тэатральнага мастацтва, а таксама партрэты супрацоўнікаў радыё і тэлебачання, якія папулярызуюць культурныя падзеі ў СМІ. Гэта спявак Валеры Дайнека, дырыжор Віктар Пласкін, віяланчэліст Алег Алоўнікаў, аўтар знакамітай «Калыханкі» пісьменнік Генадзь Бураўкін, акцёр і радыёвядучы Уладзімір Трапянок, намеснік дырэктара Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь Святлана Казюліна і інш.

Творы А. Аракчэевай знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі, Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва, іншых музеях і галерэях Беларусі і за мяжой. Аксана Іванаўна сёлета стала лаўрэатам прэміі імя Васіля Віткі.

Рэха публікацыі

Можа стаць добраю традыцыяй...

Пытанне лёсу і будучыні Слуцкага краязнаўчага музея несумненна цікавіць слуцкіх аматараў мясцовай гісторыі. Асабіста я (не адмаўляючы неабходнасці існавання ў горадзе прыстойнага месца для рэгістрацыі шлюбаў, якое цяпер мяркуецца арганізаваць у адрамантаваным старым корпусе Дома культуры) падтрымліваю пазіцыю археолага Леаніда Калядзінскага, якую ён выклаў у публікацыі («Краязнаўчая газета», № 33).

Няма сумневаў, што святкаванне 900-годдзя горада без дзейнага краязнаўчага музея будзе выглядаць не вельмі зразумелым. Праўда, працягваюць працу філіялы музея – этнаграфічны і галерэя мастацтваў, аднак наўрад ці яны змогуць кампенсаваць тыя магчымасці, якія маглі б прапанаваць асноўныя музейныя фонды, што цяпер, пад час закрытага на рамонт асноўнага корпуса, спакаваныя ў каробкі.

У 1966 годзе, калі ў горадзе рыхтаваліся да мерапрыемстваў па святкаванні 850-годдзя Слуцка (дарэчы, менавіта тады ўпершыню быў праведзены Дзень горада), гарадскія ўлады прынялі рашэнне аб перадачы для краязнаўчага музея гістарычнага будынка былога Дваранскага сходу. Бо да гэтага заснаваны ў 1952 годзе музей месціўся ў некалькіх пакойчыках гарадскога Дома культуры.

За апошнія пяцьдзясят гадоў значна павялічыліся музейныя фонды, у краіне змяніліся патрабаванні да музеяў. Прымаючы да ўвагі вышэйзгаданае, магла б атрымацца добрая традыцыя, калі пад час падрыхтоўкі святкавання наступнай круглай даты ў гісторыі Слуцка атрымаць для музея новы, больш адпаведны будынак. І найлепшым варыянтам у такім выпадку, несумненна, мог бы стаць стары корпус адрамантаванага Дома культуры. У такім выпадку назіралася б і своеасаблівая сімволіка: музей вярнуўся б на тое месца, дзе ён некалі і пачаў сваё існаванне. Па другое – гэта была б своеасаблівая «кампенсацыя» перад слуцкай гісторыяй за знішчаны помнік археалогіі – дзяцінец, які цяпер займаюць стары і новы карпусы Дома культуры.

Стары ж будынак Дваранскага сходу павінен быць не толькі адрамантаваным, але і адрэстаўраваным. Колькі для таго спатрэбіцца часу, няхай скажуць спецыялісты. Ён уваходзіць у лік трох самых старых пабудоваў горада, што захаваліся да нашага часу, датуецца канцом XVIII стагоддзя. Пасля рамонту яму не абавязкова мяняць профіль дзейнасці. Як казаў некалі беларускі гісторык Анатоль Грыцкевіч, які шмат часу прысвяціў даследаванню слуцкай даўніны, гісторыя Слуцка настолькі цікавая і насычаная падзеямі, што мала з гісторыяй якога іншага горада можа і параўнацца, хіба што з Полацкам. Несумненна, што ў горадзе маюць права на дзейнасць некалькі спецыялізаваных філіялаў гарадскога краязнаўчага музея альбо самастойныя профільныя музейныя ўстановы.

Ігар ЦІТКОЎСКІ, г. Слуцк

Жыццядзейнасць фестывальнай «Берагіні»

Чарговы фестываль «Берагіня», як і ўсе папярэднія, пераканаўча прадэманстраваў, што ён з'яўляецца адной з дзейсных формаў працы па арганізаваным далучэнні дзяцей і падлеткаў да фальклорнай спадчыны свайго краю. Пад час яго падрыхтоўкі і правядзення рэалізуюцца многія выхаваўчыя задачы. Атрыманыя веды, уменні, выдадзеныя даведнікі, кнігі, прынятая рэзалюцыя круглага стала дапамагаюць культработнікам, настаўнікам нашай краіны праводзіць сістэмную, комплексную, шматузроўневую, доўгатэрміновую працу ў галіне традыцыйнай народнай творчасці, фармаваць светапоглядныя, каштоўнасныя арыенціры ў сучаснага пакалення беларусаў у накірунку ўсведамлення значнасці, непаўторнасці традыцыйнай беларускай культуры і яе пачэснага месца ў сістэме сусветнай культуры.

Традыцыйная культура была і ёсць адным з галоўных фактараў узнікнення, падтрымання і захавання беларускай самаідэнтыфікацыі. Сістэма духоўна-маральных прыярытэтаў, інтарэсаў, сацыяльнасць чалавека залежаць ад той культуры, у межах якой адбылося яго станаўленне як асобы. Тут маецца на ўвазе нацыянальная культура, якую трэба разумець як сістэму пэўных матэрыяльных і духоўных каштоўнасцяў, сукупнасць формаў дзейнасці, характэрных для канкрэтнага народа. Культурна-псіхалагічны ўплыў на фармаванне асобы, якое адбываецца ў працэсе сацыялізацыі, звязаны з актыўным далучэннем да этнічных каштоўнасцяў. Традыцыйнае культурнае асяроддзе праграмуе этычныя, эстэтычныя нормы і стандарты паводзінаў, а таксама сацыякультурнай дзейнасці чалавека, стварае натуральныя ўмовы для пераемнасці культурных традыцыяў і культурнага побыту свайго народа. Толькі на аснове нацыянальнай культуры фармуюцца глыбінныя асновы чалавечай жыццядзейнасці, нацыянальнай самасвядомасці і нацыянальнай самабытнасці асобы, толькі этнічная культура злучае ланцужкі сацыякультурнай трансмісіі.

Хацелася б выказаць пажаданне крыху «разгрузіць» праграму хоць аднаго фестывальнага дня для непасрэдных зносінаў удзельнікаў і няспешнага абмеркавання пытанняў і праблемаў па «гарачых слядах».

Таццяна КУХАРОНАК,
старшы навуковы супрацоўнік
Цэнтра даследаванняў беларускай культуры,
мовы і літаратуры НАН Беларусі,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
пастаянны эксперт фестываляў «Берагіня»

Фота Анатоля БУЭВІЧА

Фота Наталі КУПРЭВІЧ

Вольга Нячай. Батлейка (2005 г.)

Адновім Будслаўскую святыню разам!

Нагадваем нашым чытачам, што летась Беларускі фонд культуры распачаў акцыю па зборы сродкаў на рэстаўрацыю Будслаўскага касцёла бернардзінцаў. Дапамогі патрабуюць алтар XVII ст. у капліцы Святой Варвары, арыгінальны арган XVIII ст. і фрэскі Казіміра Анташэўскага. Таксама ў планах стварэнне адпаведнай інфраструктуры і ўмоваў побыту для пілігрымаў і экскурсійных групаў. Гэтую ініцыятыву падтрымалі Нацыянальная камісія Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА, Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч, Беларускі камітэт Міжнароднай Рады па помніках і мясцінах (ІКАМОС). Сёлета акцыя працягваецца.

Вядзецца збор сродкаў на рэстаўрацыю адзінага ў Беларусі Нацыянальнага санктуарыя Маці Божай Будслаўскай. Свой уклад у гэтую справу вы можаце зрабіць непасрэдна ў касцёле Святога Сымона і Святой Алены ў Мінску, Будслаўскім касцёле Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі, а таксама пералічэннем сродкаў на дабрачынны рахунак, адкрыты пры Беларускім фондзе культуры ў Белінвестбанку. Імёны ахвяравальнікаў і назвы арганізацыяў будуць ушанаваныя на памятнай дошцы ў Будслаўскім касцёле і надрукаваныя ў «Краязнаўчай газеце».

Падаем рэквізіты для ахвяраванняў у беларускіх рублях:

№ 3135741330025, г. Минск, ОАО «Белинвестбанк», РБ. Дирекция по г. Минску и Минской области, код 739, Минск, ул. Коллекторная, 11. БИК 153100739, УНП 100081886, ОКПО 37449864; с пометкой «На реставрацию Будславского костёла»; тел. бухг. (+ 375 017) 283 28 24.

Самы малады раённы музей Беларусі

(Заканчэнне. Пачатак у № 34)

Вялікая, «чырвоная», зала змяшчае экспазіцыі прычалаў Свольна, Лісна, Асвея, Дзвіна, Дрыса. Прыродныя і гістарычныя адметнасці кожнага з іх можна прачытаць па надпісах-брэндах, убачыць на маляўнічых фрызах і вітражах вокнаў, а змесціва планшэтаў і вітрынаў паглыбляе і дэталізуе ўбачанае: і серыю войнаў XX стагоддзя з яго польскім, латышскім і нямецкімі франтамі, і карціны шалёных веснавых паводак у Дрысе-Верхнядзвінску, і буйнаквецце мірных дзён.

У шэрагі знакамітых землякоў тут паўсталі даследчык Сібіры І. Чэрскі, фізік І. Яркоўскі, геолаг М. Накоўнік, навукоўцы-гуманітарыі браты Багдановічы, пісьменнікі і паэты С. Панізьнік, Г. Героднік, Э. Зубрыцкі, Ф. Сіўко, Н. Кіслік, Н. Арсеннева і інш., мастакі Я. Ясьвін, А. Малей, В. Шчасны і іншыя.

У гэтай зале можна ўбачыць і большасць партрэтаў землякоў – Герояў Савецкага Саюза. Звесткі пра І. Кабзуна дапаўняюць яго баявая фатаграфія з кулямётам і яшчэ адна, што засведчыла момант уручэння ўзнагароды Герою М. Калініным.

У адным з «купэ» прычала Дрыса знайшлі сваё месца звесткі пра яўрэйскую галіну нашага народа, бязлітасна зрэзаную шалёным Гітлерам. Дарагія рэліквіі – Тору, малітоўнік з перакладам на рускую мову, малельную прыладу рабіна тфілін – прывезлі нам з Маскоўскага яўрэйскага музея. Карціны мінулага жыцця дрысенскага яўрэйства ілюструюць нешматлікія фатаграфіі, а таксама рэпрадукцыі карцінаў першага акадэміка жывапісу з яўрэяў Лейбы Аскназія, які нарадзіўся ў Дрысе.

Адметны вобраз стварае і невялікая зала, дзе выстаўленыя экспазіцыі прычалаў Каханавічы, Расіца, Сар'я і памежнай з Латвіяй часткі прычала Дзвіна. Усе іх найперш яднае трагічная тэма апошняй вайны. Як і на іншых прычалах, тут на кожным змешчаны фрагмент карты «Верхнядзвінскія сёстры Хатыні», дзе чырвоным колерам паказаныя спаленыя ў вайну і неўваскрэслыя вёскі, аранжавым – тыя, што былі адноўленыя, зялёным – уцалелыя і часткова пацярпелыя селішчы. Дык вось на картасхемах гэтай залы не ўбачыш ніводнай зялёнай пазнакі... Асабліва моцна і трывожна гучыць трагічная нота вайны ў экспазіцыі прычала Расіца. У гэтым спадчынным сапегаўскім мястэчку на мяжы зімы і лета 1943 года фашысцкія карнікі спалілі больш за тысячу бязвінных людзей. Разам з тутэйшым людам пайшлі ў агонь і расіцкія святары Антоні Ляшчэвіч і Юры Кашыра, якім быў прапанаваны шанец на выратаванне. Сярод рэліквіяў у вітрыне пакладзены і раман Ірыны Жарнасек пра трагедыю і веліч Расіцы «Будзь воля Твая».

Падарунак ад мастака Валерыя Шчаснага – карціна «Замак Дрыса», першая справа – дырэктар музея Маргарыта Бембель

Прычал Сар'я ўражвае выявай пярліны вогненнай готыкі – шматпакутнага Сар'янскага касцёла, на прычале Каханавічы ўслаўленае імя прагрэсіўнага дзеяча, паэта і беларускага фалькларыста Ігната Храпавіцкага, а стэнды прычала Дзвіна знаёмяць з персаналіямі адрэзанай часткі Дрысенскага павета – былых Прыдруйскай, Пустынскай і Сушкоўскай воласцяў. Сярод іх – Эдвард Вайвадзіш, які ў стогадовым узросце стаў сябрам Саюза беларускіх пісьменнікаў, мастак Пётра Мірановіч, абаронца інтарэсаў латышскіх беларусаў Ян Райніс. Тутсама партрэт першага дырэктара Чалябінскага трактарнага завода К. Ловіна, расстралянага ў Маскве ў сталінскіх засценках за свае прагрэсіўныя дзеянні па развіцці прамысловасці СССР. Асобны вітраж займае экспазіцыя пра нараджэнца маёнтка Новае Сяло Карла Касцюшку-Валюжыніча з роду вялікага Касцюшкі. Наш зямляк вядомы свету як заснавальнік Таўрычаскага археалагічнага музея пад адкрытым небам у Севастопалі.

У музеі няма кідкіх, незвычайных экспанатаў. Тым не менш усе наведнікі аднадушна заяўляюць, што знайшлі ў ім шмат невядомага раней. Большасць уражаная яго дызайнам. Дзякуючы фрызам і вітражам дзесяці музейных вокнаў ствараецца візуальная прыцягальнасць памяшкання. У дапамогу ж тым, хто захоча паглыбіцца ў змест экспанаваных матэрыялаў, паслужаць тэкставыя фрагменты, карты, схемы і шэраг дыяграмаў. Некаторыя з іх па-сапраўднаму ўнікальныя. Сярод такіх – карта былога Валынецкага раёна, надзвычай насычаныя выверанымфакталагічнымматэрыялам знішчаных паселішчаў былых Асвейскага і Дрысенскага раёнаў.

Як і варта было чакаць, наведнікі з раёна надоўга затрымліваюцца каля «сваіх» прычалаў, пазнаючы дарагія рысы родных мясцінаў і знаёмых людзей, адкрываючы для сябе невядомыя дагэтуль старонкі гісторыі свайго роднага куточка. Старонкі асобных «сшыткаў» са звесткамі пра ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў даюць магчымасць даведацца больш дэталяў пра лёсы зняволеных і расстраляных, чым гэта магчыма прачытаць на старонках кнігі «Памяць».

Госці ж Верхнядзвіншчыны больш цікавяцца слупавымі вехамі яе гісторыі, знакамітымі персаналіямі, многія ўпершыню даведваюцца пра гістарычныя сувязі сваіх мясцінаў і сваіх краінаў з самым паўночным куточкам нашай Беларусі. Сёлетнія госці Верхнядзвінска – дэлегацыя з горада Капшагай – упершыню пабачыла той кут, дзе нарадзіўся і правёў юнацкія гады Мікалай Накоўнік – чалавек, які адкрыў найбагацейшыя радовішчы каштоўных рудных выкапняў на тэрыторыі Казахстана. Новыя сябры пабяцалі ўзбагаціць адпаведную экспазіцыю сапраўднымі ўзорамі мінералаў карунда, малібдэніта, кобальтавай і медных рудаў, якія пакуль што можна бачыць толькі на фотавыявах. Мы ж аддалі наўзамен у рукі новых сяброў спіс імёнаў 70 нараджэнцаў Казахстана, якія загінулі ў баях пры вызваленні Верхнядзвіншчыны.

Самы малады ў краіне раённы музей, які распачаў працу яшчэ на стадыі свайго стварэння энтузіястамі, адразу пасля набыцця афіцыйнага статуса раскрыў свае магчымасці як навукова-культурны і грамадскі цэнтр. Акрамя абслугоўвання наведнікаў, тут ладзяцца экскурсіі і выстаўкі, у музейным дворыку праводзяцца мастацкія і літаратурна-музычныя імпрэзы, творчыя вечарыны. Супрацоўнікі музея аказваюць дапамогу студэнтам, настаўнікам, працаўнікам культуры, афіцыйным установам у пошуку і падрыхтоўцы неабходных ім матэрыялаў, часта выконваючы функцыі архіваў. Музей адразу ўпісаўся ў грамадскае жыццё раёна як доўгачаканы і неабходны яго асяродак.

Антон БУБАЛА,
старшы навуковы супрацоўнік Верхнядзвінскага гісторыка-краязнаўчага музея

А. Бубала дэманструе «Пасланне нашчадкам» у музейным дворыку

Выданні краязнаўцаў краіны

Настаўнік пасля ўрокаў: чым заняцца?

Нядаўна пабачыла свет кніга «Настаўнік пасля ўрокаў: зборнік артыкулаў», якую ўклаў краязнаўца Сымон Барыс. Разлічанае выданне на настаўнікаў гісторыі і класных кіраўнікоў школаў, гімназіяў і ліцэяў, будзе яно цікавае і краязнаўцам. Аб сваім вопыце пазакласнай працы з вучнямі расказалі 14 аўтараў, якімі сталі вопытныя настаўнікі, пераважна – выкладчыкі гісторыі. Некаторыя змешчаныя ў кнізе матэрыялы раней былі надрукаваныя ў «Беларускім гістарычным часопісе», часопісе «Гісторыя: праблемы выкладання» (цяпер «Гісторыя і грамадазнаўства»). Але, каб ахапіць усе аспекты дзейнасці настаўніка пасля ўрокаў, для кнігі былі адмыслова напісаныя яшчэ некалькі артыкулаў.

Усяго кніга змяшчае 24 артыкулы, размеркаваныя па трох раздзелах. У першым раздзеле пад назвай «Калі закончыўся ўрок» змешчаныя два артыкулы аўтара нашай газеты Валерыя Варганава «Пазакласная дзейнасць настаўніка гісторыі» і «Тыдзень гісторыі ў школе» і артыкул Дануты Кургановіч пра арганізацыю школьнага тыдня гісторыі.

У раздзеле «Краязнаўства. Музеі. Экскурсіі» змешчаныя артыкулы «Краязнаўства ў школе. Якім яму быць?» С. Барыса, «Краязнаўства і выхаванне школьнікаў: з вопыту работы» і «Гісторыка-краязнаўчы гурток у школе» В. Варганава, «Адукацыйная роля школьных музеяў» Аляксандры Кравец (дарэчы, яшчэ адной нашай аўтаркі) ды іншыя матэрыялы, якія, няма сумневу, будуць карыснымі настаўнікам гісторыі, якія шчыра зацікаўленыя сваёй працай.

У раздзел «Выхаваўчыя гадзіны. Школьныя вечарыны» ўвайшлі артыкулы «Полацк вядомы і невядомы» Людмілы Трыгорлавай, «Падарожжа ў краіну замкаў» Васіля Ракуця і С. Барыса, «История Могилёва сквозь призму веков» Галіны Бяляевай ды іншыя.

Праўда, наклад кнігі невялікі – 50 асобнікаў, і мала якія бібліятэкі ды настаўнікі змогуць яе мець. Той жа, хто зацікавіўся выданнем, можа пазнаёміцца з яго зместам у сядзібе Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны ў Мінску, на вуліцы Румянцава, 13.

Падрыхтавала Ніна КАЗЛЕНЯ

З гісторыі полацкай Сафіі

У сярэдзіне XI ст. у Полацку ў паўднёвай частцы Верхняга замка быў збудаваны велічны храм святой Сафіі (Прамудрасці Божай), адзін з трох на Русі. Храм быў пяцінефавы з трыма ўсходнімі апсідамі, гранаванымі звонку і круглымі ўнутры. Меў крыжовыя слупы, хоры, 5 купалаў, а пазней нават 7, быў багата аздоблены фрэскавым жывапісам.

Будаўніцтва полацкай Сафіі адбывалася ў 1044 – 1060 гг. пад час княжання Усяслава Чарадзея, прыблізна ў адзін час з кіеўскай (1037 г.) і наўгародскай (1045 – 1953 гг.), і ў часы, калі гэтыя княствы, асабліва Наўгародскае ды Полацкае, дасягнулі найвялікшага росквіту і магутнасці. Што падштурхнула Візантыю спрыяць збудаванню Сафіі ў Ноўгарадзе і Полацку? Верагодна, палітычная сітуацыя. У гэты час акрэсліўся раскол хрысціянства, актывізаваліся набегі на Візантыю, было неспакойна ў ваколіцах Кіева, імперыя пачала слабець, і вельмі верагодна, што акрамя хрысціянізацыі язычнікаў улада імперыі разглядала пытанне, куды пазней можа быць перанесены рэлігійны цэнтр праваслаўя. Безумоўна, на тэрыторыю дзяржавы, якая здольная гэты цэнтр абараніць. Менавіта такімі цэнтрамі на поўначы маглі стаць Полацк і Ноўгарад. Гісторыя распарадзілася інакш, і праваслаўная царкоўная ўлада ў часы Івана Грознага (XVI ст.) перайшла да Маскоўскай дзяржавы, якая на той час аказалася найбольш магутнай, а абшар Беларусі стаў месцам барацьбы паміж праваслаўнай і каталіцкай хрысціянскімі канфесіямі.

Сафія ў Ноўгарадзе

Кіравалі будаўніцтвам усіх трох храмаў дойліды з Візантыіі, таму ў іх архітэктуры знаходзім рысы падабенства – усе Сафіі пяцінефавыя, крыжовакупальныя і трохапсідныя, мелі напачатку пяць купалаў, хоры, звонку – галерэі. У полацкай Сафіі, акрамя візантыйскага ўплыву, прысутнічаюць у абрысе ваконных нішаў рысы раманскага стылю. Дах на храме быў алавяным, што звычайна для XI – XII стст., ды падлогі з маёлікавай кафлі. Археолаг Міхась Ткачоў сцвярджаў, што стары Сафійскі сабор у Полацку стаўся ўзорам для ўсіх цэркваў-фартэцыяў на тэрыторыі Беларусі. Акрамя таго, у той час дзеля барацьбы з язычніцкімі вераваннямі хрысціянскія храмы часта будаваліся на месцах капішчаў, што, магчыма, адбылося і ў Полацку.

Полацкі Сафійскі сабор зведаў усе няшчасці, што выпалі цягам стагоддзяў на долю краіны, горада і замка. Калі кіеўскі і наўгародскі храмы дайшлі да нас, захаваўшы свае муры, купалы ды іншыя часткі будынкаў, дык полацкі быў амаль цалкам разбураны. На яго месцы ў XVIII ст. з выкарыстаннем руінаў збудаваны зусім новы храм. Ад Сафіі XI ст. засталіся рэшткі ўсходняга муру з трыма апсідамі, у сутарэннях сучаснага храма засталіся асновы старых муроў, васьмібаковага слупа ў заходняй частцы, стужкавыя фундаменты, рэшткі фрэсак.

У выніку пажараў і перабудоваў стары сабор змяняў сваё аблічча. Да нас дайшлі два гістарычныя планы, зробленыя пад час аблогі горада ў 1579 г. Пахалавіцкім: адзін у апрацоўцы Яна Батыста дэ Кавальеры (Рым, 1580 г.) і другі, адшуканы польскім гісторыкам Александровічам у фондах Дрэздэнскага гістарычнага архіва. На першым плане Сафія адлюстраваная як высокая аднавежавая царква, трохнефавая з фасада. Другі паказвае царкву абарончага тыпу, якая мае чатыры высокія кутныя круглыя вежы з трыма паверхамі байніцаў і вышэйшую цэнтральную вежу з двума паверхамі байніцаў. Пад час Лівонскай вайны (1558 – 1583) пры апісанні згадваецца, што ў Сафійскім саборы знойдзеныя трое жалезных дзвярэй. Гэта можа сведчыць пра тое, што ў храме былі тры ўваходы, якія зачыняліся жалезнымі дзвярыма (пэўна, каб бараніцца). Полацкая Сафія пры ўзяцці Полацка Іванам Грозным у 1563 г. і Стэфанам Баторыем у 1579 г. служыла цытадэллю для абаронцаў. З апісання Гайдэнштэйна, гісторыка Стэфана Баторыя, бачна, што перабудовы пасля папярэдніх пажараў мала закранулі храм, і ў 1579 г. той яшчэ захоўваў свой пачатковы выгляд. Маецца яшчэ адна выява Сафійскага сабора на плане Полацка 1707 г., знойдзеным М. Ткачовым у Ленінградскім ваенна-гістарычным архіве. На гэтым плане Сафія паказаная абарончай царквой з чатырма кутнымі вежамі, але трохі ніжэйшымі і толькі з двума паверхамі байніцаў. Пятая цэнтральная вежа стала падобнай да царкоўнага купала. Змяніўся і фасад, над будынкам з'явіўся высокі дах.

Макет першапачатковага выгляду Сафійскага сабора

Калі ў 1607 г. сабор пацярпеў ад пажару, полацкае ваяводства звярнулася па дапамогу да сейма, які дазволіў «руіны старое Сафіі паправіць і адбудаваць, каб жыхары ваяводства Полацкага, сваім коштам яго збудаваўшы, там кнігі замкавыя і гарадскія свайго ваяводства захоўвалі». Уніяцкі біскуп Язафат Кунцэвіч, прыняўшы кіраванне епархіяй у 1617 г., энергічна ўзяўся за абнаўленне сабора. Вядома, што ў часе той перабудовы былі знішчаныя ўсе купалы, акрамя галоўнага, верагодна, быў заменены верхні покрыў ды зліквідаваныя закамары і какошнікі, магчыма, былі разбураныя хоры, убудаваныя новыя капліцы з алтарамі, зменены іканастас і інш. У 1643 г. полацкі замак зноў гарэў, пажар пашкодзіў і Сафію, але праз год яна была адрамантаваная і ў такім выглядзе існавала да 1710 г.

У каштарысным кнізе Полацка, складзенай у 1654 г. пасля заняцця горада маскоўскім царом Аляксеем Міхайлавічам, згадваецца «саборная царква Сафіі – Прамудрасці Божай, пабудовы папярэдніх гаспадароў, цароў і ўсіх князёў маскоўскіх, каменная, а ў ёй абразы ды царскія дзверы грэцкага пісьма на золаце». 13 чэрвеня 1656 г. у прысутнасці самога цара царква была зноў асвечаная як праваслаўная, але ў 1667 г. паводле Андрусоўскай дамовы Полацк быў вернуты Рэчы Паспалітай, а сабор зноў перададзены ўніятам.

Сафія на плане Пахлавіцкага

Полацкая Сафія на гравюры XVI ст.

Сабор Святой Сафіі ў Стамбуле

Уладзімір ЦЯЛЕЖНІКАЎ

(Заканчэнне ў наступным нумары)

Каля Прыпяці – «Кола Струменя»

Ёсць у Тураве, на зямлі свяціцеля Кірылы Тураўскага, аграсядзіба «Кола Струменя». Названая яна так, бо знаходзіцца каля рачулкі Струмень, што ўпадае ў прыгажуню Прыпяць. Гаспадарыць у сядзібе Ірына Сяргейчык, якая стварае ўтульную атмасферу для тых, хто прыязджае адпачыць, набрацца сілаў, надыхацца свежым паветрам, павудзіць рыбу... Гасцей гаспадыня сустракае ў традыцыйнай беларускай кашулі, вышытай яшчэ яе бабуляй.

Імкненне рабіць людзям дабро ў Ірыны Сяргейчык – ад яе бацькі Аляксандра і маці Ніны, якія перажылі ліхія гады вайны, вырасцілі пяць дачок: Ірыну, Ларысу, Таццяну, Святлану і Алу. Усе яны імкнуцца быць карыснымі людзям.

З вокнаў сядзібы відаць унікальны Тураўскі луг – месца, дзе жыве альбо спыняецца пад час пералёту шмат птушак, асабліва – кулікі. Калісьці гэтая хата належала дзеду Сямёну Сяргейчыку, таму цяпер яна сагрэтая памяццю аб пакаленнях колішніх гаспадароў. Не дзіўна, што госці аграсядзібы (а ў «Кола Струменя» едуць адпачываць як з Беларусі, так і з блізкага ды далёкага замежжа) пакідаюць у кнізе водгукаў добрыя словы. Напрыклад, такія: «Я адчуў сябе побач з продкамі, тут можна дакрануцца да зорак рукой». Госць з Масквы, ураджэнец Турава Іван Матох напісаў наступнае: «Нельга надыхацца такім смачным чыстым паветрам, здаецца, сама зямля ласкава вітае кожнага на Беларусі». Яшчэ адзін ураджэнец Беларусі, які цяпер жыве ў Францыі, нават не хацеў з'язджаць – так паланіла яго прыгажосць роднай зямлі.

Той жа, хто прыедзе ў сядзібу «Кола Струменя», абавязкова даведаецца пра гісторыю гэтага куточка Палесся, пра выбітных людзей Тураўшчыны – народных майстроў, вышывальшчыцаў, бондараў, лозапляцельшчыкаў, і зможа нават сустрэцца з імі.

І. Сяргейчык і М. Котаў

Мікола КОТАЎ,
пазаштатны карэспандэнт

Магдаленаўскі баль-рэканструкцыя

«Ёсць чары ў забытым,
старадаўным;
Прыемна нам сталецяў
пыл страхнуць
І жыць мінулым – гэткім мудрым,
слаўным, –
Быццё дзядоў у смутку
ўспамянуць».

(«Тэрцыны», Максім Багдановіч)

Уздзеншчына – край таленавітых і ініцыятыўных людзей, пісьменнікаў, мастакоў, краязнаўцаў... Адной са знакамітых асобаў з'яўляецца княгіня, мецэнатка і асветніца Марыя Магдалена Радзівіл. У ліпені споўнілася 155 гадоў з дня яе нараджэння.

У наш час так здараецца, што многія не ведаюць гісторыю свайго краю, нават сваё сямейнае дрэва. Забываюць наведваць бацькоўскі дом, родныя мясціны, не шануюць помнікі архітэктуры, памяць аб таленавітых людзях...

Сама Магдалена Радзівіл дзякуючы бацьку вельмі любіла сваю Радзіму: фінансавала дзіцячыя прытулкі, бальніцы, выдавецтвы, таварыствы, кнігі класікаў беларускай літаратуры, першыя беларускія газеты, адкрывала беларускія школы, будавала чыгункі. З гербам яе роду «Лебедзь» выдадзеныя першыя кнігі беларускіх пісьменнікаў: Максіма Багдановіча, Максіма Гарэцкага, Ядвігіна Ш., Якуба Коласа...

Напярэдадні аб'яўленага Магдаленаўскага балю адбылася экскурсія ў яе былы маёнтак. Менавіта нам шчасціць бачыць яго амаль такім, які ён быў пры жыцці Магдалены. Але будынкам не перашкодзіла б рэстаўрацыя!

Цяпер тут, у пасёлку Першамайск (сучасная назва. – **«КГ»**), размяшчаецца дзяржаўны сельскагаспадарчы ліцэй, і пра былую раскошу нагадваюць толькі старыя муры гаспадарчых пабудоваў, напаўразбураны кальвінскі збор ды прыгожая альтанка ў парку.

Настаўнік Павел Апановіч, нястомны краязнаўца-гісторык, правёў слухачоў па былым маёнтку, расказаў гісторыю кожнага будынка. Удзельнікі экскурсіі, а гэта былі ў асноўным маладыя людзі, паўдзельнічалі ў касцюмаванай фотасесіі.

На былых палетках маёнтка Кухцічы, дзе гаспадарылі калісьці Марыя Магдалена і Мікалай Радзівілы, цяпер працуюць хлебаробы ЗАТ «Новае жыццё» і «Агра-Кухцічы». 19 жніўня, на Яблычны Спас, з акцыяй удзячнасці «Там, дзе ступала нага Магдалены» да іх завіталі супрацоўнікі цэнтральнай раённай бібліятэкі імя П. Труса, сябры літаратурна-творчага аб'яднання «Вясёлка» Валерыя Сарока і Аляксей Буры, бібліятэкарка Сямёнавіцкай сельскай бібліятэкі Марына Кароль.

Першым на просьбу спыніцца адрэагаваў трактарыст Уладзімір Жук. Мы расказалі яму пра нашую акцыю, падзякавалі за працу, спыталі дазволу разам сфатаграфавацца. Вядома ж, мы адрывалі людзей ад справы, але ніводзін з тых, каго мы сустрэлі ў гэты дзень (Аляксандр Клімовіч, Леанід Кісель, Уладзімір Карачун), не адмовіўся пагутарыць з намі. Лера і Лёша ад імя Магдалены ўручалі механізатарам сок, ваду, цукеркі і яблыкі, мы праводзілі кароткую фотасесію, і кожны кіраваўся па сваіх справах.

...Да пасёлка Першамайск, дзе раней быў маёнтак Кухцічы, мы ехалі па старым тракце, па якім калісьці Магдалена і Мікалай Радзівілы ездзілі ў Нясвіж. Нават крыху сімвалічным нам здалося тое, што на гэтай старой дарозе мы ўбачылі яблыньку, якая аж да зямлі схіліла галінкі з прыгожымі і смачнымі пладамі.

На ініцыятыве літаратурна-творчага аб'яднання «Вясёлка», пры падтрымцы цэнтральнай раённай бібліятэкі імя П. Труса і райкама БРСМ 20 жніўня ў гонар Магдалены Радзівіл прайшоў баль-рэканструкцыя пачатку XX стагоддзя.

Госці і жыхары горада мелі магчымасць апынуцца на балі ў Магдалены, даведацца пра яе лёс, аб якім расказалі вядучыя свята Вольга Віяленцій і Надзея Скараход, станцаваць грандмарш, вальсы, па-дэ-труа, наведаць мастацкі салон, выставу мастакоў Андрэя Лычкоўскага і Яўгена Шунейкі, на карцінах якіх былі адлюстраваныя ўздзенскія краявіды. Ахвочыя замовілі свой партрэт у майстра Шунейкі, сфатаграфаваліся з «родзічамі, сябрамі і пісьменнікамі», якім Магдалена фінансавала выданне паэтычных зборнікаў. Іх увасаблялі сябры літаратурна-творчага аб'яднання «Вясёлка» Ксенія Андросік, Валерыя Сарока, Ягор Лапцэвіч, Ларыса Міхайлоўская, Ксенія Мельнікава, Артур Казаткоў, Аляксей Буры, Марыя Паўловіч, Уладзіслаў Лычкоўскі, Яніна і Аліна Шавель, Ірына Бельская, Валерыя Рудакоўская, Павел Апановіч, Надзея Скараход, Ілья Сямёнаў, Марыя Булаш, Усціння Корзун, Аліна Свідзер, Мікіта Азарко. Фотакопію партрэта Магдалены мастака Алеся Цвыркунова на баль для літаратурнага салона прадаставіў жыхар горада, мецэнат цыкла краязнаўчых календароў пра Уздзеншчыну Аляксандр Нікітка. Зацікаўленасць наведнікаў выклікала і выстава рарытэтных кніг з прыватнай калекцыі гісторыка П. Апановіча. Кожны змог разгарнуць і пачытаць фаліянты часоў Магдалены Радзівіл. Словы ўдзячнасці зямлячцы гучалі і ад мясцовых байкераў, якія завіталі падтрымаць удзельнікаў балю.

Пад час свята ў межах кампаніі «Будзьма беларусамі!» выступіла таленавітая спявачка Таццяна Матафонава. Пераможцаў віктарыны для знаўцаў біяграфіі Магдалены Радзівіл, якую правяла Святлана Чакушка, чакалі цікавыя падарункі ад кампаніі «Будзьма беларусамі!»

Традыцыйна на мерапрыемствах, якія ладзяцца з дапамогай Уздзенскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя П. Труса, праводзіцца «літаратурная прышчэпка». Вось і на балі кожны мог паўдзельнічаць у ёй і атрымаць за гэта салодкі падарунак. Ахвочыя змаглі «прышчапіцца» вершамі беларускіх паэтаў, зборнікі якіх фінансавала наша знакамітая зямлячка.

Дзякуем усім, хто паўдзельчаў і падтрымаў наш гістарычны праект. Калі мы будзем памятаць пра нашых землякоў, калісьці будуць памятаць і пра нас!..

Дзякуем табе, Марыя Магдалена Радзівіл, за любоў да беларускага слова і роднай зямлі!

Валерыя РУДАКОЎСКАЯ,
студэнтка Белдзяржуніверсітэта культуры і мастацтваў,
Ірына БЕЛЬСКАЯ, бібліятэкар Уздзенскай СШ № 1 імя А.С. Пушкіна

Слядамі даўняга вяселля

Нядаўна мы распавялі пра кружэлку «Вясельныя песні і найгрышы вёскі Лявонпаль і яе наваколляў», што выдаў паэт і грамадскі дзеяч Сяргей Панізьнік. Першыя імпрэзы-прадстаўленні прайшлі на Мёршчыне ў самім Лявонпалі ды Мілашове, адкуль быў малады.

Госці з Мінска і Полацка – мастакі, літаратары, музыкі, спевакі і танцоры – спачатку прайшліся сцежкамі, якімі хадзілі тыя, чые галасы засталіся на кружэлцы: пабачылі помнікі лявонпальскай ды мілашоўскай мінуўшчыны, ад мясцовых краязнаўцаў даведаліся пра цікавыя факты з тамтэйшай даўніны. Вядома ж, падышлі на сядзібу Шадурскіх, дзе й праходзіла вяселле Жэні Шадурскай і Франца Адамовіча, сфатаграфаваліся ў тым жа месцы, што ў 1969 г. было фонам для вясельных здымкаў.

Я. Адамовіч (Шадурская)

Першым прыпынкам быў касцёл Маці Божай Шкаплернай у Мілашове (вядомы таксама як касцёл у Ідолце). Тут у рамках «Мілашоўска-Мілашаўскіх чытанняў», што ўжо некалькі гадоў ладзіць пісьменніца Алена Масла, прайшло прадстаўленне ўнікальнай кружэлкі.

На свята завіталі спявак і мультыінструменталіст Сяржук Доўгушаў (акурат дзякуючы ягонай руплівасці і з'явіўся альбом), выканаўца народных песень Юлія Літвінава, фальклорны гурт «Варган» з Полацкага ўніверсітэта, якім кіруе Вольга Емяльянчык. Удалося адшукаць і колішнюю маладуху – Яўгенію Сяргееўну Адамовіч (Шадурскую).

Імпрэза адбывалася праз тыдзень пасля шлюбу мастачкі Крысціны Пержуковай, дачкі А. Масла, што надало сустрэчы своеасаблівае адценне. Так і перапляліся дзве падзеі. Напачатку слова мелі акурат маці маладой і свацця, знаная телевядучая Ларыса Мятлеўская. Далей выступілі госці – гучалі вясельныя песні, найгрышы ды танцы (сярод іх – «Пастаўскі вальс» ад палачанаў). Напрыканцы выступіла Я. Адамовіч.

– Сёння мы сабраныя дзякуючы празорлівасці Сяргея Панізьніка, – зазначыла яна. – Дзіўлюся, наколькі ён, тады 27-гадовы хлопец, быў мудры. На вяселле сабраліся мае аднакласнікі, прыйшоў і Сяргей – на плячы два фотаапараты, магнітафон, ды й папрасіў зрабіць запіс. Я пагадзілася. І вось праз амаль 50 гадоў запіс той не толькі спатрэбіўся, але й стаўся падзеяй. А мне асабліва прыемна, што я далучаная да ўсяго. І сённяшняя сустрэча – дзякуй арганізатарам – сталася вяртаннем у маладосць.

А далей усіх запрасілі да роднага дому Алены Масла. Там адбылося адкрыццё мастацкай галерэі. Яе незвычайнасць у тым, што размясцілася яна ...у пуні. Калі маладая мастачка прыязджала на пленэр, новыя карціны пакідала сохнуць акурат тут. Вось дзядуля Сцяпан Масла, былы настаўнік, і вырашыў, што гэта добрае месца для майстэрні. З часам яна перарасла ў галерэю «Пуня». Першымі тут выстаўленыя творы Крысціны і яе настаўніцы Аксаны Аракчэевай.

А. і С. Масла (справа) з маладымі і свацьцяй

Завяршылася мілашоўская імпрэза сустрэчаю ў Друі ў дзіцячым доме. А. Масла распавяла, што, запрашаючы на вяселле, усім казалі не браць з сабою кветак – прынесці падарункі для выхаванцаў дзіцячага дома. Разам з перадачаю падарункаў у Друі прайшла і прэзентацыя новай кнігі А. Масла «Мяне завуць Лахнэска».

У Лявонпалі ж імпрэза прайшла ў мясцовым клубе, дзе размяшчаецца і «Музей Радзімазнаўства», створаны С. Панізьнікам. Напачатку сустрэчы намеснік галоўнага рэдактара «Краязнаўчай газеты» Уладзімір Пучынскі распавёў сваім землякам пра новы альбом, зазначыў, што тут – частка з выдадзеных у лічбавым фармаце запісаў Сяргея Панізьніка, якія гэты чалавек рабіў цягам жыцця.

– Вы ведаеце любімую прыказку Сяргея Сцяпанавіча? – запытаўся У. Пучынскі. – Іх шмат у паэта, але тут я размову вяду пра словы «Будзем памятаць мы – будуць помніць і нас». І праз паўстагоддзя матэрыялы, запісаныя ад звычайных, як у нас прынята казаць, людзей, аказаліся запатрабаванымі. Прычым, не толькі ў родных мясцінах – знайшлі водгук яны і ў Мінску, іншых рэгіёнах краіны, нават за мяжою, у Чэхіі, Канадзе... Значыць, край наш слаўны і багаты духоўна.

Заводзяць публіку В. Емяльянчык, Ю. Літвінава і С. Доўгушаў (справа налева)

Далей лідар гурта «Vuraj» С. Доўгушаў зайграў на парнай дудцы і на колавай ліры, спяваў песні; Ю. Літвінава прапанавала вясельную песню «Ай борам, борам, барамі». А гурт «Варган» выканаў колькі абрадавых песень з розных рэгіёнаў Беларусі. Былі вясельны марш, падэспань, полькі, кракавяк звычайны і кракавяк у тройках... І калі дайшла чарга вальса, мала хто застаўся сядзець. Акрамя гэтага, госці распытвалі пра мясцовыя традыцыі, аб тым, якія танцы былі ў пашане тут, а таксама навучылі полацкаму танцу «Распалоска».

Былі на свяце ўнучка Маруты Пальчэх, чый голас захаваў запіс, Тамара Пятроўна Шчарбакова і ўдзельніца гістарычнага ўжо вяселля Марыя Пятроўна Сушко. Свае вітанні перадалі ўдзельнікам Я. Адамовіч, С. Панізьнік і паэтка, нараджэнка Лявонпаля Галіна Загурская. А вось што згадала спн. Сушко:

– Гэта было звычайнае па тых часах вяселле: елі, пілі, танцавалі, лазілі на дах, жартавалі. З вёскі Ліпава запрошаныя вельмі добрыя музыканты. Спявалі ўсе, а не толькі, як цяпер, пара чалавек ці магнітафон. І моладзь спявала. Паколькі не было тады аўтобусаў, то на другі дзень гасцей перавозіла ў Мілашова грузавая машына, якую даў калгас.

Свята скончылася, але засталіся запісы, што з кожным годам толькі набываюць каштоўнасць.

Уладзімір ПІРОГ
Фота Уладзіміра ПУЧЫНСКАГА

М. Сушко

Наш каляндар

Станіслаў Панятоўскі –

340 гадоў з дня нараджэння

15 верасня 1676 г. у с. Хойнік Малапольскага ваяводства нарадзіўся Станіслаў Панятоўскі – дзяржаўны і ваенны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, падстолій (1722) і падскарбій вялікі літоўскі (1722 – 1731), ваявода мазавецкі (1731 – 1752), кашталян кракаўскі (з 1752), генерал артылерыі Вялікага Княства Літоўскага (1707 – 1709), удзельнік Паўночнай вайны (1700 – 1721).



Прадстаўнік шляхецкага роду Панятоўскіх герба «Цёлак», сын Францішка, лоўчага падляшскага, і Алены з Невяроўскіх. Атрымаў адукацыю ў Вене. Потым запісаўся ў аўстрыйскае войска, ваяваў пад кіраўніцтвам прынца Яўгена Савойскага. Вярнуўся на радзіму, у канфлікце паміж Сапегамі і шляхтай выступіў на баку Сапегаў, разам з імі перайшоў у часе Паўночнай вайны на бок караля Швецыі Карла XII. Удзельнічаў у бітвах супраць Аўгуста Моцнага і расійскіх войскаў, у бітвах пад Галоўчынам (1708) і Палтавай (1709), дзе ўратаваў жыццё Карлу XII.

У 1720 г. ажаніўся ў другім шлюбе з князёўнай Канстанцыяй Чартарыйскай, якая ў 1721 г. набыла маёнтак Воўчын у Берасцейскім павеце (Камянецкі р-н), дзе неўзабаве былі збудаваныя касцёл і палац – рэзідэнцыя Панятоўскіх. У гэтым шлюбе нарадзіліся дзеці: Казімір (1721 – 1800) – падкаморы вялікі каронны (1742 – 1773), генерал польскага войска; Францішак (1723 – 1749) – канонік і пробашч кафедральнага касцёла ў Кракаве; Станіслаў Аўгуст (1732 – 1798) – кароль польскі і вялікі князь літоўскі; Андрэй (1734 – 1773) – генерал-лейтэнант аўстрыйскага войска (1760), фельдмаршал (1771), князь Свяшчэннай Рымскай імперыі; Міхал Ежы (1736 – 1794) – біскуп плоцкі (1773), архібіскуп гнезненскі (1784).

Падрыхтаваў Алесь САЧАНКА

Наш каляндар

«Наша доля нас ня знае, жыцьце наша – ноч і цьма...»

«Наша Доля», першая легальная грамадска-палітычная і літаратурная газета «для вясковага і местачковага рабочага люду», выйшла ў свет 1(14) верасня 1906 г. Яна друкавалася лацінкай і кірыліцай, выходзіла на васьмі старонках. Наклад першага нумара склаў 10 тысячаў асобнікаў. Стваральнікамі газеты была група сяброў Беларускай Сацыялістычнай Грамады, а выдаўцом і рэдактарам – жыхар Вільні Іван Тукеркес.

Ідэйны кірунак «Нашай Долі» вызначалі публіцыстычныя матэрыялы: «Што будзе?», «Даход расійскага цара», «Аб народных дэмакратах», «Колькі стояць рускія генералы», «Як мужыку палепшыць сваё жыццё» ды іншыя. Таксама ў газеце друкаваліся падборкі карэспандэнцыяў «З Беларусі і Літвы», «Па Расеі», «Усяго па троху», на старонках гучалі заклікі да салідарнасці незалежна «ад веры і народнасці», бо «ўсё гэта браты па бядзе і нядолі».

Не дзіўна, што газета адразу прыцягнула пільную ўвагу ўладаў. Ужо на наступны дзень пасля выхаду першы нумар быў канфіскаваны, а ў рэдакцыі паліцыя ўчыніла ператрус. У той жа дзень кіраўнік канцылярыі Віленскага, Ковенскага і Гродзенскага генерал-губернатара падпісаў цыркуляр аб забароне «Нашай Долі» і прыцягненні І. Тукеркеса да судовай адказнасці. Пачалося судовае следства, аднак газета працягвала выходзіць. Трэці нумар быў канфіскаваны за публікацыю верша Якуба Коласа «Беларусам», у якім паэт пісаў:

Ці ж мы, хлопцы, рук не маем?
Ці ж нам сілы бог не даў?
Ці ж над родным нашым краем
Промень волі не блішчаў?

Шырока разгарнуць сваю дзейнасць «Наша Доля» так і не здолела. Чатыры з шасці нумароў былі канфіскаваныя, сёмы быў знішчаны яшчэ ў наборы. Віленская судовая палата неаднаразова разглядала справы пра арышт газеты, а 11 студзеня 1907 г. вынесла прысуд: спыніць выданне і на год зняволіць рэдактара.

Газета перастала існаваць, але ў прамежку паміж чацвёртым і пятым нумарамі «Нашай Долі» чытачы атрымалі першы нумар «Нашай Нівы», якую чакаў даўжэйшы і больш шчаслівы лёс.

Падрыхтавала Ніна КАЗЛЕНЯ

Творцы Рагачоўшчыны

Сёлетні Дзень беларускага пісьменства прайшоў у Рагачове.

Наша зямля шчодрая на таленты. Да Рагачоўшчыны маюць адносіны такія славутыя беларускія пісьменнікі, як Міхась Лынькоў, Андрэй Макаёнак, Аляксей Зарыцкі, Алена Васілевіч, Уладзімір Караткевіч, Мікола Гроднеў і дзясяткі іншых. Тут рабілі першыя крокі ў літаратуру маладыя хлопцы, якім не суджана было прыйсці з Вялікай Айчыннай вайны, – Алесь Жаўрук, Мікола Сурначоў, Алег Радыёнаў, Рыгор Лынькоў (Суніца).

Тут, на рагачоўскай зямлі, нясуць мастацкае слова іх наступнікі. Менавіта яны па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам нястомнага працаўніка на ніве культуры Нінэль Падгурскай у свой час паклапаціліся аб тым, каб сабраць спадчыну празаікаў, паэтаў, драматургаў, публіцыстаў, якія праславілі наш край, падрыхтаваць да друку і разам з творамі сучасных літаратараў Рагачоўшчыны апублікаваць у літаратурна-мастацкіх альманахах.

Першы з іх называецца «Рагачоўскі розгалас», ён пабачыў свет у 1996 годзе (дарэчы, гэта быў першы за ўсю гісторыю горада і раёна альманах). Значнае месца ў кнізе адведзенае творчасці самадзейных мастакоў, скульптараў, разбяроў па дрэве – таленавітых людзей Рагачоўшчыны.

У 1998 годзе выйшаў другі зборнік твораў літаратараў раёна – «Залаты рог».

Трэці альманах – «У вянок Рагачову» – чытачы атрымалі ў 2001 годзе. Зборнік быў прысвечаны 55-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Першыя два зборнікі выйшлі ў Магілёўскай абласной друкарні імя Спірыдона Собаля накладам па тысячы асобнікаў, апошні – 300 асобнікаў. Кнігі радуюць не толькі зместам, але і паліграфічным выкананнем, паступілі ва ўсе бібліятэкі горада і раёна, сталі выдатным падарункам шматлікім гасцям з розных рэгіёнаў Беларусі, а таксама дэлегацыям гарадоў-пабрацімаў з іншых краінаў. А самае галоўнае – кнігі выклікаюць вялікую цікавасць і прыносяць карысць навучэнцам, настаўнікам, краязнаўцам, шырокаму колу чытачоў. І сучаснікі, і нашыя нашчадкі будуць удзячныя людзям, якія працавалі над гэтымі кнігамі, – Нінэль Падгурскай і ўсім работнікам дзіцячай бібліятэкі (цяпер – дзіцячы аддзел цэнтральнай раённай бібліятэкі), паэту і педагогу, стваральніку літаратурнага музея «Пісьменнікі-землякі» Уладзіміру Немізанскаму (пра яго раней пісала «КГ»), кіраўнікам горада, раёна і прадпрыемстваў, якія выдзялялі сродкі на выданне каштоўных кніг – літаратурных альманахаў Рагачоўшчыны.

Міхась СЛІВА
Фота Раісы БАРАВОЙ

Хлеб і да хлеба

Уздоўж

2. Хлеб – усяму ... (прык.). **6**. Рух наперад, развіццё. **8**. ... – хлеба дзяжа (прык.); адна з народных назваў свята ўраджаю – Першай Прачыстай, Успення (28 жніўня). **9**. Булачны выраб у выглядзе кальца; радзімай ... ў Беларусі лічыцца Смаргонь, а помнік яму ўсталяваны ў Стамбуле (Турцыя). **12**. Цыбуля з часнаком – родныя ... (прык.); помнік цыбулі знаходзіцца ў Венгрыі, а часнаку – у ЗША (штат Мічыган). **13**. Абласны горад у Расіі, дзе ўсталяваны помнік перніку. **14**. Горная парода. **15**. Хлеб – над панамі ... (прык.). **16**. Невялікі кій. **17**. «Беларускай бульбе слава // Ходзіць шумна з краю ў ..., // Бульбе помнік мы паставім». З верша В. Голуба «Бульба»; помнікі бульбы ўсталяваныя ў Швецыі, Румыніі, Польшчы, Германіі, Расіі. **18**. ... на спіне, дык і хлеб на стале (прык.). **20**. Горад на Брэстчыне, дзе ў 2014 г. быў усталяваны помнік беларускаму хлебу, а ў Лідзе ёсць помнік хлебу ў выглядзе снапа. **22**. Сей жыта ў прысак, а ... у гразь, то будзеш князь (прык.). **24**. Абшар, далягляд. **25**. Харчовы прадукт з прэснага цеста ў выглядзе трубачак; помнік ... – у сталіцы Францыі Парыжы. **26**. На пустым месцы і ... не расце (прык.). **27**. Усё станоўчае, карыснае. **28**. Блін з дранай бульбы, які з'яўляецца амаль брэндам Беларусі; помнік ... знаходзіцца ў Корасцені (Украіна).

Упоперак

1. ... – хлебу падмога (прык.). **3**. Запал, моцнае захапленне. **4**. Жаночае імя. **5**. Вараны піражок, начынены тварагом, ягадамі; помнікам ... могуць пахваліцца жыхары гарадоў Сургут і Ейск (Расія), Чаркасы (Украіна). **7**. Трэці, ... Спас; назва хлебнага, арэхавага Спаса, які адзначалі 29 жніўня. **8**. Тое, што і адхон. **10**. Глыбокая павага. **11**. Горад на Міншчыне, дзе знаходзіцца помнік курынаму яйку. **17**. У каго родзе ..., у таго і каўбаса тлуста (прык.); помнік гэтай агародніне ўсталяваны ў Томску і Ніжнім Ноўгарадзе (Расія). **19**. Плод агароднай культуры, помнік якому ўпрыгожвае адзін з куточкаў Шклова. **21**. ... з возу – каню лягчэй (прык.). **22**. Дэталь хадавога механізму гадзіннікаў. **23**. Тое, што і танцы (разм.). **24**. Яблыкі, грушы і іншыя плады, якія апалі ад ветру; помнік яблыку ёсць у гарадах Курску (Расія), Алматы (Казахстан) і Іерусалім (Ізраіль), помнік грушам існуе ў Канберы (Аўстралія), а ў Кіеве ёсць фантан «Груша».

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ



Адказы на крыжаванку, змешчаную ў № 35

Уздоўж: **2**. Галава. **6**. Уздым. **8**. Спажа. **9**. Абаранак. **12**. Браты. **13**. Тула. **14**. Скарн. **15**. Пан. **16**. Кіёк. **17**. Край. **18**. Пот. **20**. Пінск. **22**. Авёс. **24**. Абсяг. **25**. Макарона. **26**. Трава. **27**. Дабро. **28**. Дранік

Упоперак: **1**. Бульба. **3**. Азарт. **4**. Ванда. **5**. Варэнік. **7**. Малы. **8**. Скос. **10**. Шанаванне. **11**. Салігорск. **17**. Капуста. **19**. Агурок. **21**. Кума. **22**. Анкер. **23**. Скокі. **24**. Апад.

Верасень

22 – Таўлай Галіна Валянцінаўна (1946, Мінск), этнамузыколаг, даследчык праблемаў функцыянавання, стылістыкі, музычнай тыпалогіі, беларускага песеннага фальклору – 70 гадоў з дня нараджэння.

23 – Радзівіл Ганна Кацярына (дзяв. **Сангушка**; 1676, мяст. Ракаў – 1746), гаспадарчая дзяячка ВКЛ, заснавальніца шэрагу прадпрыемстваў у Беларусі, мецэнатка – 340 гадоў з дня нараджэння.

23 – Свістуновіч Сямён Сцяпанавіч (1946, Ляхавіцкі р-н), мастак дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, жывапісец – 70 гадоў з дня нараджэння.

23 – Якубовіч Павел Ізотавіч (1946, Расія), журналіст, выдавец, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» (2006) – 70 гадоў з дня нараджэння.

24 – Буракоўская Ніна Іванаўна (1936, Расія), вучоны-этнограф, спецыяліст у галіне народных рамёстваў – 80 гадоў з дня нараджэння.

24 – Валовіч Антоні Эразм (1711 – 1770), дзяржаўны і рэлігійны дзеяч ВКЛ – 305 гадоў з дня нараджэння.

24 – Купрыянаў Вадзім Яўгенавіч (1936, Расія), аператар, рэжысёр, сцэнарыст дакументальнага і навукова-папулярнага кіно, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1986) – 80 гадоў з дня нараджэння.

24 – Незабітоўскі (Незабытоўскі) Станіслаў Прэцлаў (1641, Навагрудскі р-н – 1717), мемуарыст, успаміны якога з'яўляюцца каштоўнай крыніцай па гісторыі грамадска-палітычнага жыцця Беларусі і Літвы канца XVII ст., дзяржаўны і гаспадарчы дзеяч – 375 гадоў з дня нараджэння.

25 – Кляцкоў Міхаіл Нікіфаравіч (1946, Расія), мастак дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, творы якога знаходзяцца ў фондах Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі, у музеі Гомельскага палацава-паркавага ансамбля, прыватных калекцыях, – 70 гадоў з дня нараджэння.

25 – Максімаў Сяргей Васільевіч (1831, Расія – 1901), расійскі і беларускі этнограф, фальклярыст, пісьменнік – 185 гадоў з дня нараджэння.

25 – Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой», дзяржаўная ўстанова, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва (2014) – 45 гадоў з дня ўрачыстага адкрыцця.

25 – «Міранка» (Карэліцкі р-н; 1996), гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння – 20 гадоў з часу стварэння.

25 – «Швакшты» (Пастаўскі р-н; 1996), гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння – 20 гадоў з часу стварэння.

26 – Сабаленка Эла Раманаўна (1936, Гомель), вучоны-этнограф, даследчык традыцыйнай матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў, сямейнага побыту, сучасных этнічных працэсаў, этнаграфічнай спадчыны Якуба Коласа і інш. – 80 гадоў з дня нараджэння.

27 – Ждановіч Ірына Фларыянаўна (1906, Мінск – 1994), актрыса, педагог, народная артыстка Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1948) – 110 гадоў з дня нараджэння.

28 – Аляхновіч Міхал (1746, Польшча – 1782), правазнаўца, педагог-піяр, прафесар права ў Галоўнай школе ВКЛ – 270 гадоў з дня нараджэння.

28 – Вяргей Валянціна Сяргееўна (1946, Петрыкаў), вучоны-археолаг, аўтар працаў па гістарыяграфіі археалогіі Беларусі і гісторыі насельніцтва беларускага Палесся жалезнага веку – 70 гадоў з дня нараджэння.

29 – Лабачэўская Вольга Аляксандраўна (1951, Расія), мастацтвазнаўца, этнолаг – 65 гадоў з дня нараджэння.

29 – Смоліч Аркадзь Антонавіч (1891, Клічаўскі р-н – 1938), вучоны ў галіне эканомікі, сельскай гаспадаркі, картаграфіі, геаграфіі, адзін з заснавальнікаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і адзін з распрацоўшчыкаў яе першага статута, першы беларускі прафесар геаграфіі і аўтар першага падручніка «Геаграфія Беларусі», які вытрымаў шмат перавыданняў, палітычны і грамадскі дзеяч – 125 гадоў з дня нараджэння.

29 – Якапін Франц (1921, Славенія – 2003), славенскі філолаг-славіст, даследчык беларускай мовы, член-карэспандэнт Славенскай акадэміі навук і мастацтваў – 95 гадоў з дня нараджэння.

30 – Астаповіч Аркадзь Антонавіч (1896, Мінск – 1941), графік, які працаваў у жанры лірычнага пейзажа ў тэхніках акварэлі і тушы, – 120 гадоў з дня нараджэння.

30 – Гілевіч Ніл Сымонавіч (1931, Лагойскі р-н – 2016), паэт, літаратуразнаўца, фальклярыст, перакладчык, грамадскі дзеяч, народны паэт Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Янкі Купалы (1980) і Міжнароднай прэміі імя Х. Боцева (1986) – 85 гадоў з дня нараджэння.

30 – Дземянчук Валянціна Пятроўна (1951, Украіна), мастак дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва – 65 гадоў з дня нараджэння.

30 – Несцярэнка Васіль Емяльянавіч (1941, Шумілінскі р-н), мастак, які працуе ў розных жанрах станковага жывапісу, педагог – 75 гадоў з дня нараджэння.

30 – Семілетаў Барыс Аляксандравіч (1956, Мінск), мастак манументальна-дэкаратыўнага і ўжытковага мастацтва, жывапісец, творы якога знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва, прыватных калекцыях у Беларусі і за мяжой, – 60 гадоў з дня нараджэння.

Адказы на крыжаванку, змешчаную ў № 34

Уздоўж: **1**. Гара. **5**. «Юдзіф». **8**. Каласы. **9**. Дзяга. **11**. Морс. **13**. Заслаўе. **15**. Мова. **17**. Лясы. **18**. Цяг. **19**. Кода. **20**. Плод. **21**. Міф. **23**. Лука. **24**. Маці. **25**. Фёдараў. **29**. Кант. **31**. Гонар. **33**. Нясвіж. **34**. «Мужык». **35**. Рака.

Упоперак: **2**. Рог. **3**. Хата. **4**. Ясна. **6**. Дом. **7**. Ідыёма. **10**. Яр. **12**. Сатыра. **14**. Лявоніха. **16**. Ваяводка. **20**. Полацк. **22**. Літары. **26**. Дзяк. **27**. Апіс. **28**. Ян. **30**. Тры. **32**. Ода.

Сяброўская сустрэча

Апошняя жнівеньская нядзеля выдалася спякотнай – каля 30 з самай раніцы. Я была запрошаная на гарбату да мастака Івана Чарнякевіча з жонкай Верай. Тым больш, Вера дапісала дзве працы. І мне вельмі карцела на іх глянуць. А калі сказаць па праўдзе, дык хацелася бальзаму – шчырай душэўнай размовы. Рэдка можна сустрэць такое, калі збіраюцца аднадумцы і тэмаў не шукаюць, плынь іх размоваў пераліваецца праз край, бы тая вада ў веснавой рэчцы. Горад іх і дзяцей – Санкт-Пецярбург. Там майстэрня, сябры, але на радзіму цягне. Ды й гутарка Іванам вядзецца толькі па-беларуску.

Мастака І. Чарнякевіча людзі мастацтва ведаюць і любяць. Яго выстаўку ў музеі-сядзібе «Пружанскі палацык» памятаюць гараджане, чакаюць новых сустрэчаў. А карціны ён падараваў музею. Гаспадарскі клопат адымае ў Івана шмат часу па навядзенні парадку ў бацькоўскай хаце; Вера шчыруе побач. Падбірае шпалеры, колер фарбы для падлогі і дзвярэй. Абое радуюцца, што хата моцная, паслужыць ім лецішчам яшчэ доўга, дасць сілы і натхнення.

Цёплая размова ў цяньку дрэваў, што помняць мастака яшчэ хлапчуком, зацепліла і мае думкі новымі вершамі.

Сонца паціху хілілася за край неба, духата паветра ўсё яшчэ трымалася. Развітанне каля веснічак абяцае сустракацца часцей. Тым больш, наперадзе размова пра выстаўкі ў Брэсце і за межамі краіны.

Ніна ДЫДЫШКА,
г. Пружаны

Малая краязнаўчая энцыклапедыя

(Пачатак у № 1 за 2003 год)

ПАДАЛІ́НСКІ Міхал (1783, Аршаншчына – 1856) – гравёр, педагог. Творчасць звязаная з мастацкім жыццём Беларусі і Літвы. Скончыў Віленскі ўніверсітэт. З 1822 г. выкладаў малюнак у гімназіі, потым ва ўніверсітэце Вільні, з пачатку 1880 г. у Мінскай гімназіі. Захаваліся афорты, партрэты прафесараў Віленскага ўніверсітэта В. Герберскага, І. Франка, В. Пелікана, канцлера Вялікага Княства Літоўскага Л. Сапегі (паводле жывапіснага арыгінала XVII ст.).

ПАДА́ННЕ – жанр фальклору; вуснае апавяданне, у якім з элементамі меншай ці большай фактычнай сапраўднасці тлумачыліся рэальныя з'явы навакольнага жыцця, расказвалася пра значныя гістарычныя падзеі роднага краю, пра народных герояў. Паданні, як і легенды, блізкія да казак, але вызначаюцца не толькі займальнасцю; у своеасаблівай форме яны неслі людзям веды пра навакольны свет і гісторыю краю.

Беларускія паданні вядомыя з часоў Кіеўскай Русі (пра Рагнеду, Усяслава Чарадзея). Захаваліся летапісныя апавяданні, у аснову якіх пакладзеныя народныя паданні пра воінскія подзвігі герояў, якія абаранялі родную зямлю ад захопнікаў («Паданне пра Кажамяку»). Цікавыя і паэтычныя паданні пра гістарычнае мінулае ў беларускіх хроніках XVI ст., напрыклад, у «Хроніцы Быхаўца» (пра паходы Гедзіміна на Украіну і Альгерда на Маскву, пра заснаванне Вільні ды інш.). Беларускія паданні тэматычна падзяляюцца на гістарычныя – пра войны, барацьбу з іншаземнымі захопнікамі, пра эпідэміі («Адкуль рубеж», «Поле татарына», «Бітва пад Лясной», «Пра 1812 год»), пра гістарычных асобаў і герояў («Пра княжэ Яраслава», «Пятро Вялікі», «Платон-казак»); тапанімічныя – пра паходжанне гарадоў, мястэчак, вёсак, урочышчаў, гарадзішчаў і інш. («Пра заснаванне Магілёва», «Адкуль Нясвіж», «Дзявочая горка»).

Паданні і легенды перадаваліся з пакалення ў пакаленне і былі своеасаблівай гістарычнай памяццю народа. Сюжэт падання пра народнага героя разбойніка Машэку выкарыстаў Янка Купала ў паэме «Магіла льва». Паводле гэтай паэмы і п'есы Е. Міровіча («Машэка») Р. Пукст напісаў оперу «Машэка».

ПАДАРО́ЖЖА ў літаратуры – 1) падарожныя нарысы, запіскі, у якіх даецца апісанне падарожнікам геаграфічных, прыродных, этнаграфічных, сацыяльна-гістарычных звестак пра наведаныя краіны, землі, новыя мясціны, іх насельніцтва і г.д.; часам мемуары ў форме падарожнага нарыса або дзённік падарожніка; 2) мастацкі твор, пабудаваны на прыёмах і спосабах адлюстравання дакументальнага падарожжа.

У гісторыі беларускай літаратуры найбольш пашыраны 1-ы від, пачатак якога адносіцца да т.зв. хаджэнняў. Элементы падарожжа ёсць таксама ў «Жыціи Ефрасінні Полацкай», у якім апавядаецца пра яе паломніцтва на Блізкі Усход, у асобных частках беларускіх летапісаў і хронік, прысвечаных апісанню ваенных паходаў.

(Заканчэнне артыкула ў наступным нумары)

«Падарожжа па святой зямлі» М.К. Радзівіла

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 08 мая 2014 г.
Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры»; Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Вітольд Ермалёнак, Алесь Карлюкевіч, Людміла Кірухіна, Адам Мальдзіс, Сяргей Мітраховіч, Вячаслаў Рагойша, Павел Сапоцька, Віктар Скорабагатаў, Тадэуш Стружэцкі.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6.
Тэл. 283-28-26.
Тэл./факс 334-42-03
E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае.
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 15.09.2016
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14).
Ліцэнзія ЛП № 02330/85 ад 23.01.2014.
Заказ 609.
Тыраж 624 асобнікі.